**УДК [94(476):34]"1840/1872"**

# СУДОВАЯ СІСТЭМА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1840 – 1872 гг.

***канд. гіст. навук, дац. І.Г. ГУШЧЫНСКІ***
***(Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, Мінск)***

*У артыкуле даследавана судовая сістэма, якая дзейнічала на тэрыторыі Беларусі ў 1840 – 1772 гг., у перыяд ад распаўсюджання на ўсю тэрыторыю края дзеяння тагачаснай расійскай мадэлі судаводства і судаўладкавання да пачатку рэалізацыі тут судовай рэформы 1864 г. Дадзеная судовая сістэма характарызавалася груваcткасцю судаўладкавання і архаічнасцю працэсуальных норм, што ў рэшце паставіла ўрад перад неабходнасцю правядзення карэннай рэформы правасуддзя. Судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі ў разглядаемы перыяд у цэлым паўтарала агульнаімперскую. Разам з тым яна мела некаторыя асаблівасці, якія заключаліся ў пэўным абмежаванні, у параўнанні з унутрырасійскімі губернямі, правоў дваранства па выбарах на судовыя пасады.*

***Ключавыя словы:*** *судовая сістэма, судаўладкаванне, судаводства, Расійская імперыя, тэрыторыя Беларусі, заходнія губерні, Звод законаў Расійскай імперыі.*

**Уводзіны.** У чэрвені 1840 г. у Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях указам Мікалая І было скасавана дзеянне Статута ВКЛ 1588 г. і сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай [1]. Тым самым быў завершаны працэс усталявання на тэрыторыі Беларусі судовай сістэмы расійскага ўзору. У Віцебскай і Магілёўскай губернях гэта адбылося раней – у выніку царскага ўказа ад 1 студзеня 1831 г. [2]. Да гэтага часу судовая сістэма краю істотна адрознівалася ад агульнарасійскай і захоўвала рысы судова-прававых парадкаў часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Дзейнічаў Статут ВКЛ 1588 г., мясцовую спецыфіку мела судаўладкаванне (функцыянавалі галоўныя, земскія, гродскія, межавыя, эксдывізарскія, кампрамісарскія суды), у судаводстве магла выкарыстоўвацца польская мова. Гэта было звязана з тым, што расійскія ўлады доўгі час лічыліся са спецыфікай правасвядомасці мясцовага насельніцтва і папярэднімі прывілеямі дваранства і гарадоў, прызнавалі мясцовыя судова-прававыя парадкі дастаткова эфектыўнымі ў сферы рэгулявання прыватна-прававых адносін, і ў цэлым бачылі ў гэтым элемент забеспячэння лаяльнасці насельніцтва (у першую чаргу шляхты). Аднак паўстанне 1830 – 1831 гг. справакавала зварот самадзяржаўя да дзеянняў, накіраваных на ўніфікацыю краю з унутранымі губернямі імперыі. Важнейшым складальнікам гэтай палітыкі стала скасаванне мясцовых асаблівасцей у сферы правасуддзя і ўкараненне расійскага судова-прававога ладу. Уведзеная ў выніку гэтага ў краі сістэма судаўладкавання і судаводства дзейнічала (з некаторымі зменамі) да 1872 г., калі тут пачалася рэалізацыя судовай рэформы 1864 г.

Тэма судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў 1840 – 1872 гг. у навуковай і вучэбнай літаратуры з'яўляецца практычна неасветленай. Разглядаючы праблему правасуддзя ў краі ў XIX ст., аўтары засяроджвалі ўвагу на перыядах да скасавання Мікалаем І мясцовых асаблівасцей судаўладкавання і судаводства, а таксама пасля ўвядзення тут судовай рэформы 1864 г. Адносна ж перыяду 1840 – 1872 гг. практычна толькі канстатавалася, што ў краі дзейнічалі расійскія судовая сістэма і заканадаўства. Таму заяўленая ў назве артыкула тэма бачыцца актуальнай. Яе раскрыццё дазволіць сфарміраваць у гістарыяграфіі дэтальную і комплексную карціну працэсу эвалюцыі судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў перыяд знаходжання краю ў складзе Расійскай імперыі.

**Асноўная частка.** *1. Скасаванне мясцовых асаблівасцей судаўладкавання і судаводства.* Як ужо было адзначана, судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі пасля далучэння да Расіі яшчэ доўгі час захоўвала элементы судова-прававых традыцый часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Безумоўна, дадзеная сістэма мела шматлікія недахопы – архаічнасць права, груваcткасць судаўладкавання і дубліраванне падсуднасці судовых органаў, валакіта і інш. Аднак яе скасаванне і замена расійскай было абумоўлена палітычнымі матывамі. Гэта была спантанная рэпрэсіўная рэакцыя самадзяржаўя на паўстанне 1830 – 1831 гг.

Паводле ўказа Мікалая І ад 1 студзеня 1831 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях укаранялася сістэма судовых устаноў расійскага ўзору і расійскія парадкі ў сферы судаводства [2]. Справаводства ў судах тут пераводзілася цалкам на рускую мову. Галоўнае значэнне дадзенага ўказа заключалася ў скасаванні ў Віцебскай і Магілёўскай губернях дзеяння мясцовага права (Статута ВКЛ 1588 г. і сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай). Асабліва гэта было важна для сферы грамадзянскага судаводства. Яно цяпер практычна страчвала рысы спаборнасці і вуснасці. Спыняў функцыянаванне інстытут адвакатуры. У выніку адмены ў 1831 г. дзеяння III Статута ВКЛ і ўвядзення сістэмы судаўладкавання расійскага ўзору Магілёўская і Віцебская губерні станавіліся часткай адзінай прававой прасторы з унутрырасійскімі губернямі. Разам з тым рабіліся больш выразнымі адрозненні гэтых губерняў ад Мінскай, Гродзенскай і Віленскай. Да таго ж, у 1830-я – першай палове 1850-х гг. дадзеныя часткі тэрыторыі Беларусі ўваходзілі ў розныя генерал-губернатарствы [3, с. 68]. Паказальна, што ў гэты час пры выкарыстанні ў афіцыйных дакументах тэрміна

"заходнія губерні" (пад якім да гэтага разумелася ўся далучаная ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыя) Магілёўская і Віцебская часта ўжо не меліся на ўвазе [4– 8].

У Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях дзеянні ўлад па ўніфікацыі мясцовай судовай сістэмы з агульнарасійскай у перыяд паўстання 1830 – 1831 гг. і адразу пасля яго былі менш радыкальнымі. У 1831 г. урад абмежаваўся прысваеннем судовым установам гэтых губерняў назваў іх расійскіх аналагаў, а таксама скасаваннем у паветах гродскіх судоў, якія спецыялізаваліся на крымінальных справах [4]. Пры гэтым працягвалі дзейнічаць эксдывізарскія, кампрамісарскія і межавыя суды, якіх не прадугледжвала расійская сістэма судаўладкавання. У сферы грамадзянскага судаводства пакуль захоўвалася ў моцы дзеянне Статута ВКЛ 1588 г. і сеймавых канстытуцый Рэчы Паспалітай. У працы судоў па-ранейшаму магла выкарыстоўвацца польская мова. Наступным крокам на шляху ўніфікацыі судовай сістэмы Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў з агульнарасійскай стала ўвядзенне тут паводле ўказа Мікалая І ад 3 снежня 1833 г. совесных судоў [5; 9, с. 35]. Канчаткова мясцовыя асаблівасці ў судовай сістэме ў дадзеных губернях былі скасаваны паводле ўказа Мікалая І ад 25 чэрвеня 1840 г. [1]. З гэтага моманту судовыя ўстановы павінны былі прытрымлівацца расійскіх норм судаводства і выкарыстоўваць у сваёй працы толькі рускую мову [10, с. 7].

*2. Сістэма судовых устаноў.* Разгледзім сістэму судаўладкавання, якая была ўведзена на тэрыторыі Беларусі ў выніку вышэйапісаных дзеянняў улад па скасаванні мясцовых асаблівасцей у судова-прававой сферы. Сістэма судовых устаноў была вызначаная ў "Своде учреждений государственных и губернских", змешчаным у 1-м томе "Свода законов Российской Империи". Яна грунтавалася на "Учреждениях для управления губерний Всероссийской империи" 1775 г., якія ў свой час, пры Кацярыне ІІ, ужо дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі (акрамя той яе часткі, якая была далучана да Расіі ў выніку 3-га падзелу Рэчы Паспалітай). Аднак з таго часу расійская сістэма судаўладкавання карэкціравалася і таму зноў укаранялася ў краі ў некалькі відазмененым выглядзе.

*2.1. Павятовыя суды.* У павятовых гарадах знаходзіліся павятовыя ("уездные") суды. Яны з'яўляліся судом 1-й інстанцыі для ўсіх саслоўяў, акрамя гарадскіх абывацеляў (для апошніх былі прадугледжаны асобныя суды – гарадавыя магістраты, ратушы, славесныя суды). Павятовыя суды разглядалі як крымінальныя, так і грамадзянскія справы.

Склад павятовых судоў у Віцебскай і Магілёўскай губернях фарміраваўся з павятовага суддзі і 2-х засядацеляў, якіх выбірала дваранства (тэрмінам на 3 гады), а таксама канцылярскага апарату [11, с. 140; 12, с. 171]. У Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях склад павятовых судоў адрозніваўся наяўнасцю яшчэ аднаго засядацеля – па прызначэнні ад урада (фактычна губернскага праўлення). Фармальна засядацелі ад урада замянялі тут засядацеляў ад непрыватнаўласніцкіх сялян [13]. Аднак у іншых мясцовасцях, дзе ў павятовых судах таксама не было сялянскіх засядацеляў, чыноўнікі ад кароны замест іх не прызначаліся. Увядзенне гэтых пасад менавіта ў Мінскай, Віленскай і Гродзенскай губернях было мерай, відавочна, абумоўленай недаверам улад да мясцовага дваранства і накіраванай на кантроль за дзейнасцю павятовых судоў. Акрамя таго, у дадзеных губернях вакантныя пасады па выбарах ад дваранства ў выпадку адсутнасці кандыдатур маглі замяшчацца чыноўнікамі, прызначанымі па распараджэнні міністра ўнутраных спраў [7]. А ў 1852 г. Віленскі вайсковы губернатар увогуле атрымаў права адмяняць у падведамных яму губернях (Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай) вынікі дваранскіх выбараў на пасады павятовых суддзяў, калі выбраныя кандыдатуры прызнаваліся ім нядобранадзейнымі ці няздольнымі выконваць судзейскія абавязкі [14]. Замест іх Віленскі вайсковы губернатар мог сам прызначаць чыноўнікаў на гэтыя пасады. У 1861 г. у сувязі з ростам праяў антыўрадавых настрояў у краі было ўвогуле прыпынена правядзенне дваранскіх выбараў [15, с. 155]. Дадзеная мера спачатку насіла часовы характар, аднак у сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. выбары так і не былі адноўлены. У выніку гэтага выбарныя ад дваранства судовыя пасады сталі замяшчацца па распараджэнні губернскага начальства.

Паводле ўказа Аляксандра ІІ ад 8 чэрвеня 1860 г. быў утвораны інстытут судовых следчых. Раней функцыю следства выконвала паліцыя. Цяпер жа яна ўскладалася на чыноўнікаў, падведамасных Міністэрству юстыцыі – судовых следчых. Дадзеныя пасады ствараліся пры павятовых судах. Судовыя следчыя паралельна лічыліся членамі гэтых судоў і маглі выконваць функцыі суддзі (акрамя спраў, па якіх яны вялі следства). Кандыдатуры на гэтыя пасады вызначаліся губернатарам па ўзгадненні з губернскім пракурорам і зацвярджаліся міністрам юстыцыі [16].

Пры павятовых судах знаходзіліся дваранскія апекі. Яны займаліся пытаннямі апякунства над сіротамі, удовамі, састарэлымі, недзеяздольнымі, марнатраўцамі з ліку дваран, кіраваннем вымарачнымі маёнткамі і інш. У склад дваранскіх апек уваходзілі павятовыя суддзі і засядацелі павятовых судоў, а таксама павятовы прадвадзіцель дваранства ў якасці старшыні [17, с. 212].

Павятовыя суды выконвалі таксама натарыяльныя функцыі. Для гэтага пры іх былі прадугледжаны спецыяльныя аддзелы крэпасных спраў (за выключэннем павятовых судоў у губернскіх гарадах, дзе адпаведныя аддзелы дзейнічалі пры палатах грамадзянскага суда) [17, с. 206–207]. Яны натарыяльна завяралі і рэгістравалі дакументы аб правах уласнасці [18, ч. І, с. 103].

*2.2. Магістраты і ратушы, славесныя суды.* Для гарадскіх абывацеляў судом 1-й інстанцыі з'яўляліся гарадавыя магістраты (ці ратушы – у заштатных і невялікіх гарадах). Ім былі падсудны як крымінальныя, так і грамадзянскія справы. Паводле заканадаўства гарадавыя магістраты складаліся з выбіраемых гараджанамі

2-х бургамістраў і 4-х ратманаў, а таксама сакратара і канцылярскіх служачых. Для ратуш дапускалася наяўнасць толькі 1-го бургамістра і 2-х ратманаў [17, с. 245–246]. Адзначым, што для гарадоў заходніх губерняў, апроч Кіева і Вільні, было прадугледжана правіла, што трэцяя частка членаў магістратаў і ратуш павінна была выбірацца ад яўрэяў [6].

Як і павятовыя суды, гарадавыя магістраты выконвалі і апякунскую функцыю. Пры іх знаходзіліся сірочыя суды, якія фактычна былі аналагам дваранскіх апек. У склад сірочага суда ўваходзілі гарадскі галава, 2 члены гарадавога магістрата, а таксама гарадавы стараста [17, с. 248; 6].

Пры магістратах і ратушах многіх беларускіх гарадоў дзейнічалі славесныя суды (таксама іх называлі гандлёвымі славеснымі судамі). Яны ствараліся для хуткага вырашэння грамадзянскіх эканамічных спрэчак (па закупцы і продажу тавараў, грашовых пазыках і інш.) [19, с. 479]. Дадзеныя суды складаліся з 2-х выбарных ад гарадской грамады славесных суддзяў (тэрмінам на 1 год) [17, с. 249; 12, с. 222]. Судовы разбор адбываўся вусна з удзелам суцяжнікаў. На вырашэнне спрэчкі суду адводзілася не больш 8-мі дзён. Калі суд не ўкладваўся ў гэты тэрмін, справа перадавалася ў гарадавы магістрат (ці ратушу) [17, с. 250]. Наяўнасць гандлёвых славесных судоў давала магчымасць прадпрымальнікам пазбегнуць пісьмовага і абцяжаранага бюракратычнымі працэдурамі судовага працэсу ў звычайным парадку грамадзянскага судаводства. Незадаволеныя рашэннем гандлёвага славеснага суда маглі звярнуцца з тым жа іскам у гарадавы магістрат (ці ратушу) [17, с. 250]. Адзначым, што на тэрыторыі Беларусі славесныя суды былі не ва ўсіх гарадах. Так, паводле звестак "Памятных книжек…" Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў за 1869 г., такія суды дзейнічалі толькі ў 20-ці (з 47-мі) паветах дадзеных губерняў. З іх 9 – у Мінскай губерні, 6 – у Віцебскай, 4 – у Магілёўскай, 1 – у Віленскай, а ў Гродзенскай славесных судоў не было [20–24].

У 1866 г. на большай частцы Расійскай імперыі гарадавыя магістраты і ратушы былі скасаваны [25]. Іх справы перайшлі ў падсуднасць павятовых судоў. Пры гэтым у гарадах працягвалі дзейнічаць сірочыя і славесныя суды. Славесныя былі ліквідаваны ў 1872 г. у сувязі з увядзеннем міравых судоў [26], а сірочыя суды дзейнічалі да канца 1917 г.

*2.3. Палаты крымінальнага і грамадзянскага суда.* Судамі 2-й інстанцыі з'яўляліся палаты крымінальнага і грамадзянскага суда (крымінальныя і грамадзянскія палаты), якія знаходзіліся ў губернскіх гарадах. Яны разглядалі справы ўсіх саслоўяў. Крымінальныя палаты ажыццяўлялі рэвізію крымінальных спраў, вырашаных судамі 1-й інстанцыі. А па службовых злачынствах чыноўнікаў яны самі былі судом 1-й інстанцыі [17, с. 146]. Прыгаворы крымінальных палат маглі ўступіць у сілу толькі пасля адабрэння губернатара. У выпадку яго нязгоды з прыгаворам справа перадавалася на рэвізію ў Сенат. Палаты грамадзянскага суда былі судом 2-й інстанцыі па грамадзянскіх справах [17, с. 147]. Апеляцыі на іх рашэнні падаваліся ў Сенат [17, с. 154]. Акрамя непасрэдна разгляду судовых спраў грамадзянскія палаты выконвалі натарыяльныя функцыі. Для гэтага пры іх дзейнічалі спецыяльныя аддзелы крэпасных спраў [17, с. 145].

Палаты крымінальнага і грамадзянскага суда складаліся са старшыні, саветніка (таварыша старшыні), 2 – 4-х засядацеляў, а таксама канцылярскага апарату [11, с. 139; 17, с. 142]. Старшыні палат прызначаліся царом з ліку кандыдатур, якія прапаноўваў міністр юстыцыі па ўзгадненні з мясцовым генерал-губернатарам (вайсковым губернатарам). Пры гэтым адзначым, што ў астатніх губернях кандыдаты на пасады старшынь палат выбіраліся мясцовым дваранствам [17, с. 143]. Саветнікаў палат у заходніх губернях прызначаў міністр юстыцыі па ўзгадненні з генерал-губернатарам (вайсковым губернатарам). У іншых жа губернях саветнікі прызначаліся Сенатам [17, с. 143–144]. Таксама ў склад крымінальнай і грамадзянскай палат уваходзілі засядацелі. Іх на 3-гадовы тэрмін выбірала дваранства губерні і гарадская грамада губернскага горада. Паводле агульнага правіла, у кожнай з палат павінна было быць 4 засядацелі (2 дваранскіх і 2 гарадскіх) [17, с. 144; 12, с. 171, 213]. Аднак на практыцы гарадскія засядацелі ў складзе крымінальных і грамадзянскіх палат некаторых губерняў адсутнічалі. Так, на тэрыторыі Беларусі ў разглядаемы перыяд яны пэўны час былі толькі ў Магілёўскіх і Віцебскіх палатах крымінальнага і грамадзянскага суда. А ў тых крымінальных і грамадзянскіх палатах заходніх губерняў, дзе гарадскіх засядацеляў не было, замест іх былі ўведзены штатныя адзінкі засядацеляў ад урада (па адным у кожнай з палат). Яны прызначаліся мясцовым губернскім начальствам. Улада абгрунтоўвала гэту меру тым, што купецтва ў заходніх губернях было прадстаўлена амаль цалкам яўрэямі [6; 27]. Пасля прыпынення ў 1861 г. правядзення дваранскіх выбараў і надзялення надзвычайнымі паўнамоцтвамі губернатараў у сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. прызначаемымі ад улады сталі і пасады дваранскіх засядацеляў.

У 1867 г. у Гродзенскай, Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай губернях палаты крымінальнага і грамадзянскага суда былі аб'яднаны ў адзіныя судовыя ўстановы – злучаныя палаты крымінальнага і грамадзянскага суда [28].

*2.4. Совесныя суды.* У губернскіх гарадах таксама знаходзіліся совесныя суды. Ім былі падсудны пэўныя віды крымінальных і грамадзянскіх спраў. Да ліку крымінальных спраў, якія разглядаліся совеснымі судамі, адносіліся галоўным чынам тыя, якія мелі змякчальныя абставіны для абвінавачанага. Напрыклад, адсутнасць злоснага намеру, вар'яцтва, малалецтва, глупства і недасведчанасць (пад апошнія дзве прычыны падпадалі, напрыклад, справы, звязаныя з чараўніцтвам). Таксама гэтыя суды разглядалі справы аб

абразах дзяцьмі сваіх бацькоў. Прыгаворы совесных судоў па крымінальных справах перадаваліся на зацвярджэнне грамадзянскаму губернатару. Калі той выказваў нязгоду, справа накіроўвалася для канчатковага вырашэння ў Сенат [17, с. 156–157]. Да грамадзянскіх спраў, падсудных совесным судам, адносіліся цяжбы паміж бацькамі і дзяцьмі, альбо ў выпадку сумеснага па ўзаемнай згодзе звароту бакоў за вырашэннем спрэчкі ў прымірэнчым парадку. Грамадзянскія справы ў совесным судзе павінны былі абавязкова заканчвацца міравой згодай. Калі суду гэтага дасягнуць не ўдавалася, то справа альбо перадавалася ў Сенат (калі гэта была спрэчка паміж бацькамі і дзяцьмі), альбо, ва ўсіх астатніх выпадках, бакам рэкамендавалася звярнуцца ў звычайны суд паводле падсуднасці справы [18, Ч. I, с. 589–590]. У склад совеснага суда ўваходзілі совесны суддзя (у якасці старшыні), засядацелі, а таксама канцылярскі апарат. Совеснага суддзю выбірала дваранства губерні. Засядацелі таксама выбіраліся. Паводле агульнага правіла іх павінна было быць 6 (па 2 ад дваран, гарадскіх саслоўных груп і непрыватнаўласніцкіх сялян) [17, с. 155–156; 29]. Але ў рэчаіснасці ў склад прысутнасці совесных судоў на тэрыторыі Беларусі ўваходзілі, апроч совеснага суддзі, толькі засядацелі ад дваран. Тэрмін паўнамоцтваў совеснага суддзі і засядацеляў складаў 3 гады [12, с. 171, 213].

У 1852 г. урадам было прынята рашэнне аб скасаванні совесных судоў у шэрагу губерняў, у тым ліку Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губернях. Справы скасаваных совесных судоў перадаваліся ў палаты крымінальнага і грамадзянскага суда. Пры гэтым захоўвалася штатная адзінка совеснага суддзі, які ўдзельнічаў у разглядзе палатамі крымінальнага і грамадзянскага суда спраў, падсудных раней совесным судам [30].

*2.5. Трацейскія суды.* Расійскім заканадаўствам былі прадугледжаны трацейскія суды, якія дазвалялі вырашаць грамадзянскія спрэчкі не ў звычайным судовым парадку, а праз пасрэдніка. Дадзеныя суды былі аналагам кампрамісарскіх судоў, якія дзейнічалі ў краі да пераходу на расійскую мадэль судаўладкавання. Для вырашэння справы праз трацейскі суд бакі павінны былі заключыць адпаведную дамову. У ёй апісваўся прадмет цяжбы, вызначаліся пасрэднікі, акрэсліваліся тэрміны вырашэння спрэчкі. Таксама маглі агаворвацца такія моманты, як па закону альбо па сумленні будзе разбірацца справа, ці можна будзе бакам аспрэчваць рашэнне трацейскага суда ў звычайным судовым парадку, і інш. Дамова павінна была быць засведчана ў мясцовым судзе 1-й інстанцыі [18, Ч. I, с. 575]. Такая форма суда давала магчымасць суцяжнікам больш хутка вырашыць спрэчку.

*2.6. Паліцэйскія суды.* Ва ўмовах абвастрэння палітычнай сітуацыі ў заходніх губернях у жніўні 1861 г. расійскія ўлады вырашылі стварыць тут так званыя паліцэйскія суды. Іх разгляду падлягалі менш значныя палітычныя справы, якія да гэтага вырашаліся ў адміністрацыйным (пазасудовым) парадку. Да такога кшталту спраў адносіліся тыя, якія былі звязаны з публічнымі праявамі нелаяльнасці да ўрада (выказванні, спевы, нашэнне польскіх знакаў, непадпарадкаванне ўладам падчас хваляванняў і г.д.). Вырашэнне гэтых спраў у адміністрацыйным парадку, без суда, выклікала крытыку ўлад за самавольства. Стварэнне паліцэйскіх судоў, па задумцы ўрада, адпавядала задачы хуткага і няўхільнага пакарання за антыўрадавыя дзеянні, але пры гэтым у рамках судовых працэдур. Паліцэйскія суды мелі 2 інстанцыі. Суд 1-й інстанцыі ствараўся пры павятовым судзе губернскага горада. У яго склад уваходзілі павятовы суддзя, адзін з засядацеляў павятовага суда і член-камісар па прызначэнні ад урада. Апеляцыі на прыгаворы паліцэйскіх судоў 1-й інстанцыі разглядалі так званыя апеляцыйныя паліцэйскія суды, якія знаходзіліся ў Вільні і Кіеве. Склад апеляцыйнага паліцэйскага суда фарміраваўся па распараджэнні генерал-губернатара з аднаго са старшынь судовых палат (крымінальнай ці грамадзянскай), аднаго з таварышаў старшынь судовых палат і аднаго з саветнікаў губернскага праўлення. Рашэнні апеляцыйных паліцэйскіх судоў лічыліся канчатковымі і маглі быць адменены толькі царом. У якасці меры пакарання паліцэйскія суды маглі выкарыстаць арышт і грашовы штраф. Іх тэрмін і сума маглі дасягаць, адпаведна, некалькіх месяцаў і соцень рублёў [31]. Паліцэйскія суды, прынамсі восенню 1861 г., дзейнічалі дастаткова актыўна [32, с. 22; 33; 34; 35, арк. 140адв.], за выключэннем Віцебскай губерні, дзе ў такі суд на працягу года не паступіла ніводнай справы [36, арк. 9]. Усяго паліцэйскімі судамі на тэрыторыі Беларусі было асуджана каля 300 чалавек [37, с. 65].

*3. Характэрныя рысы судаводства.* Нарматыўную базу функцыянавання судовай сістэмы краю ў 1840–1872 гг., натуральна, склалі заканадаўчыя акты Расійскай імперыі. У 1832 г. быў выдадзены “Свод законаў расійскай імперыі”, у 15-ці тамах якога было сістэматызавана заканадаўства Расійскай імперыі. Крымінальнае і грамадзянскае судаводства грунтавалася на інквізіцыйных пачатках [38, с. 656]. Гэта значыць, што ў судовым працэсе практычна адсутнічаў прынцып спаборнасці. Функцыі як абвінавачвання, так і абароны выконваў сам суд. Гэта фактычна выключала вуснае судагаварэнне, якое мела месца толькі ў славесных судах. Разбор спраў судом адбываўся негалосна, за зачыненымі дзвярыма без удзелу бакоў. У тым ліку гэта датычыла судаводства па грамадзянскіх справах, бо суцяжнікі павінны былі прадастаўляць суду свае аргументы ў выглядзе пісьмовых дакументаў. У такой сістэме не было месца інстытуту адвакатуры. У грамадзянскіх справах суцяжнікі маглі ажыццяўляць свае працэсуальныя правы праз davеraных асоб (павераных), аднак спецыяльных патрабаванняў да іх кампетэнцый закон не прадугледжваў [18, с. 376–377].

Наглядам за дзейнасцю судовых устаноў (прытрымліваннем імі законнасці, належным выкананнем чыноўнікамі сваіх абавязкаў і г.д.) займаліся губернскі пракурор, губернскія страпчыя (казённых і крымінальных спраў), а таксама павятовыя страпчыя [17, с. 214–215]. Губернскія пракуроры і страпчыя прызначаліся Сенатам

па прапанове міністра юстыцыі [17, с. 159]. Павятовых страпчых прызначала губернскае праўленне па прадстаўленні губернскага пракурора [17, с. 213]. У 1872 г. пасады страпчых былі скасаваны, а іх функцыі перададзены судовым следчым і таварышам губернскага пракурора [9, с. 42].

Высокую ступень уплыву на дзейнасць судовай сістэмы мела губернскае начальства – генерал-губернатары, вайсковыя і грамадзянскія губернатары. Праз права зацвярджаць ці не зацвярджаць вынікі дваранскіх і гарадскіх выбараў [17, с. 60] яны маглі кантраляваць склад судоў. Больш таго, з 1852 г. яны атрымалі права замяняць выбраных дваранствам павятовых суддзяў на падставе іх нядобранадзейнасці ці нядольнасці на прызначаных чыноўнікаў [39, с. 21]. Акрамя таго, губернскія начальнікі фактычна прымалі ўдзел непасрэдна ў вырашэнні судовых спраў. Дастаткова сказаць, што на іх зацвярджэнне паступалі ўсе прыгаворы крымінальных палат [17, с. 65]. Пры гэтым трэба адзначыць, што аб’ём судовых спраў, якія патрабавалі візы губернатара, быў вельмі вялікім. Натуральна, губернатары не маглі асабіста ўнікаць ў абставіны кожнай справы і самастойна прымаць па іх рашэнні. У такой сітуацыі станавілася вельмі важнай роля губернатарскай канцылярыі і яе чыноўнікаў пры разглядзе судовых спраў. У канцылярыях губернатараў цэлае аддзяленне (з 4-х) было спецыяльна прызначана для стасункаў з судовымі ўстановамі [40, с. 181].

Укараненне расійскай судовай сістэмы пры Мікалаі І не вырашала асноўных праблем судаводства, якія мелі месца ў папярэдні перыяд. Па-ранейшаму дакладна неакрэсленымі заставаліся межы падсуднасці судовых устаноў, у выніку чаго аналагічныя справы разглядаліся рознымі судамі. Тэрміны разгляду спраў, як правіла, не рэгламентаваліся, што нярэдка прыводзіла да зацягвання вырашэння судовых спраў на доўгія гады. Так, згодна з “Отчётом Министерства юстиции за 1865 год” (фактычна апошні год функцыянавання на ўсёй тэрыторыі імперыі судовай сістэмы старога ўзору) па палатах крымінальнага суда Расійскай імперыі спраў, якія доўжыліся звыш 20-ці гадоў, было 19, звыш 15-ці – 52, звыш 10-ці – 243, звыш 5-ці – 10 242 [41, с. 108]. Па палатах грамадзянскага суда адпаведныя лічбы былі яшчэ больш значнымі: звыш 20-ці гадоў – 75, звыш 15-ці – 150, звыш 10-ці – 552 справы [41, с. 111]. І гэта без уліку спраў, якія ляжалі ў павятовых судах, Сенаце і іншых інстанцыях. Пасля пераходу на расійскія парадкі судаводства ў заходніх губернях праца судоў некаторы час ускладнялася тым, што мясцовым судовым чыноўнікам, натуральна, быў патрэбны час на вывучэнне новых законаў. Недахопам судовай сістэмы з’яўлялася фактычна адсутнасць такога важнага інстытута, як адвакатура. Прававым анахранізмам з’яўлялася практыка пакідання ў падазрэнні падсудных, віна якіх не была даказана, але і не абвергнута [42, с. 306, 314], што значна абмяжоўвала грамадзянскія правы такіх асоб.

**Заключэнне.** Такім чынам, з 1840 г. на ўсёй тэрыторыі Беларусі дзейнічала агульнаімперская мадэль судовай сістэмы. Яе ўкараненне было абумоўлена палітычнымі матывамі і з’яўлялася важнейшай складовай часткай палітыкі самадзяржаўя па ліквідацыі асаблівага статусу заходніх губерняў, у якім улада бачыла патэнцыяльную пагрозу новай хвалі сепаратызму. Разам з тым трэба адзначыць, што татальнай уніфікацыі мясцовай судовай сістэмы з агульнаімперскай усё ж не адбылося. Для заходніх губерняў былі зроблены некаторыя выключэнні з агульных правіл фарміравання кадравага складу судовых устаноў, накіраваныя на ўзмацненне кантролю над сферай правасуддзя. Судовая сістэма характарызавалася грувасткасцю судаўладкавання і архаічнасцю працэсуальных норм. На працягу разглядаемага перыяду яна паступова прыходзіла ў неадпаведнасць з патрабаваннямі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Адказам урада на гэта стала правядзенне судовай рэформы, змест якой быў адлюстраваны ў Судовых статутах ад 20 лістапада 1864 г. Яны прадугледжвалі якасна новую судовую сістэму, заснаваную на прынцыпах усесаслоўнасці, аддзялення судовай улады ад адміністрацыйнай, спаборнасці і галоснасці. Аднак па палітычных матывах на тэрыторыі Беларусі рэалізацыя рэформы доўгі час адкладвалася і пачалася толькі ў 1872 г.

ЛІТАРАТУРА

1. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – Собр. 2. – Т. 15. – 1840. – Отд. 1. – № 13591.
2. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 6. – 1831. – Отд. 1. – № 4233.
3. Киселев, А.А. Система управления и чиновничество белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в. / А.А. Киселев. – Минск : Воен. акад. РБ, 2007. – 171 с.
4. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 6. – 1831. – Отд. 2. – № 4894.
5. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 8. – 1833. – № 6599.
6. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 11. – 1836. – № 9226.
7. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 13. – 1838. – Отд. 1. – № 11041.
8. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 32. – 1857. – Отд. 1. – № 32314.
9. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917) / сост. Т.Е. Леонтьева. – Минск : БелНИИДАД, 2006. – 392 с.
10. Марозава, С.В. Адмена Статута ВКЛ (1831 г., 1840 г.) і рэакцыя на яе беларускай шляхты / С.В. Марозава // Весн. Гродз. дзярж. ун-та. – 2005. – № 4. – С. 3–8.
11. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 8. – 1833. – Отд. 2. – № 6287.
12. Свод законов Рссийской империи, повелением государя императора Николая Павловича составленный. Учреждения. – СПб. : Тип. II Отд. Собств. Его Император. Величества Канцелярии, 1833. – Ч. III. – 534 с.

13. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 15. – 1840. – Отд. 1. – № 14016.
14. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 27. – 1852. – Отд. 1. – № 26301.
15. Грышкевіч, Т.В. Саслоўнае і бессаслоўнае самакіраванне / Т.В. Грышкевіч, А.П. Жытко, С.А. Талмачова // Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1917–1772 гг. / рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі ; Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2018. – С. 153–184.
16. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 35. – 1860. – Отд. 1. – № 35890.
17. Свод законов Рссийской империи, повелением государя императора Николая Павловича составленный. Учреждения. – СПб. : Тип. II Отд. Собств. Его Император. Величества Канцелярии, 1833. – Ч. II. – 903 с.
18. Свод законов Рссийской империи, повелением государя императора Николая Павловича составленный. Законы гражданские и межевые. – СПб. : Тип. II Отд. Собств. Его Император. Величества Канцелярии, 1832. – 754, 258, 164 с.
19. Свод законов Рссийской империи, повелением государя императора Николая Павловича составленный. Уставы государственного благоустройства. – СПб. : Тип. II Отд. Собств. Его Император. Величества Канцелярии, 1833. – Ч. I–III. – 963 с.
20. Памятная книжка Виленской губернии на 1869 год. – Вильна : В тип. губ. правл., 1869. – 213 с.
21. Памятная книжка Витебской губернии на 1869 год. – Витебск : В тип. губерн. правления, 1869. – 180 с.
22. Памятная книжка Гродненской губернии на 1869 год. – Гродно : В тип. губерн. правления, 1869. – 139, XI, 141 с.
23. Памятная книжка Минской губернии на 1869 год. – Минск : В тип. губерн. правления, 1868. – 341 с.
24. Памятная книжка Могилёвской губернии на 1869 год. – Могилёв : В тип. губерн. правления, 1868. – 345 с.
25. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 41. – 1866. – Отд. 1. – № 43183.
26. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 47. – 1872. – Отд. 1. – № 50524.
27. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 19. – 1844. – Отд. 1. – № 18456.
28. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 42. – 1867. – Отд. 1. – № 44616.
29. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 10. – 1835. – Отд. 2. – № 8456.
30. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 27. – 1852. – Отд. 1. – № 26396.
31. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 36. – 1861. – Отд. 2. – № 37327.
32. Буднік, І.Ф. Да падзеяў 1863–64 гг. на Гарадзеншчыне / І.Ф. Буднік. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2013. – 108 с.
33. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 952. Воп. 1.
34. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 159. Воп. 1. Спр. 6672–6688.
35. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1405.
36. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 30894.
37. Смирнов, А.Ф. Восстание 1863 в Литве и Белоруссии / А.Ф. Смирнов. – М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1963. – 392 с.
38. История суда и правосудия в России : в 9 т. – М. : Норма, 2019. – Т. 3: Судоустройство и судопроизводство периода становления и развития абсолютизма (конец XVII – середина XIX века) / отв. ред. С. А. Колунтаев. – 672 с.
39. Шелкопляс, В.А. Судебные органы в Беларуси: конец XVIII – первая половина XIX веков : учеб. пособие / В.А. Шелкопляс. – Минск : Акад. МВД РБ, 1997. – 64 с.
40. Ерошкин Н.П. История государственных учреждений дореволюционной России / Н.П. Ерошкин. – М. : Высш. школа, 1983. – 352 с.
41. Отчёт Министерства юстиции за 1865 год (окончание) // Журн. М-ва юстиции. – 1867. – № 2–3. – С. 95–138.
42. Свод законов Рссийской империи, повелением государя императора Николая Павловича составленный. Свод законов уголовных. – СПб. : Тип. II Отд. Собств. Его Император. Величества Канцелярии, 1832. – 560 с.

*Паступіў 15.10.2020*

**THE JUDICIAL SYSTEM ON THE TERRITORY OF BELARUS IN 1840–1872**

***I. HUSHCHYNSKI***

*The article presents a study of the judicial system that was in force in the territory of Belarus in 1840–1772. – i.e. during the period from the moment of extending the Russian justice model to entire territory of the region to the beginning of implementation the judicial reform of 1864. This judicial system was characterized by cumbersome judiciary and archaic procedural rules. This ultimately put the government in front of the need for radical judicial reform. The judicial system on the territory of Belarus in the period under review generally repeated the imperial one. At the same time, it had some peculiarities, which consisted in a certain restriction, in comparison with the internal Russian provinces, of the rights of the nobility to elect judicial positions.*

***Keywords:*** *judicial system, judiciary, legal proceedings, Russian Empire, territory of Belarus, Western provinces, the Code of Laws of the Russian Empire.*